# Крапоткін аб расійскай рэволюцыі.

П. Крапоткін, вядомы тэорэтык комуністычнага анархізму, жыу да вясны селетняга году у адным мястэчку Маскоускай губэрні. Адтуль напісау ен ліст да свайго прыяцеля Юрыя Брандэса, у якім лісьце разьвівае свой пагляд на расійскую рэволюцыю і стараньні антанты задушыць гэту рэволюцыю.

Крапоткін робіць параўнаньне цяперашняй расійскай рэволюцыі з якабінскай рыволюцыяй у Францыі (ад верасьня 1793 да ліпня 1794 году) і зьвяртае увагу, што дыктатарская мэтода Якобінцау была памылкай. Заслугай якобінскай рэволюцыі было скасаваньне фэодальных праў і апавяшчаньне політычнай роунасьці правоу—для усіх. Гэтые дзьве рэформы мелі вялікае гістарычнае значэньне для Эуропы.

Бальшавікі намагаюцца правясьці социялізацыю зямлі, прамыслова-фабрычных вырабоу і гандлю, якая есьць аснауным прынцыпам социялізму. Аднак, прынятая бальшавікамі мэтода чыннасьці шляхам дыктатуры адной фракцыі социялістычнай партыі нічуць не давядзе да мэты, але, наадварот, выклікае дзікую рэакцыю, якая мае сабе за мэту адбудаваньне былшага царскага парадку.

Крапоткін выступае проці аружнай інтэрвэнцыі антанты у Расіі, асьцерагаючы дзяржавы антанты перад роляй нямецкай інтэрвэнцыі у Расіі у 1918 г.

Дзяржавы антанты, падтрымліваючы Калчака і Дэнікіна, думаюць, што падтрымліваюць расійскую лібэральную партыю. Аднак гэта есьць памылка, бо якіе ня былі-бы думкі гэтых двух павадыроу, мэты іх прыхільнікау зусім не лібэральные; яны, гэтые прыхільнікі, думаюць аб адбудаваньні манархіі ды рэакцыі.

Лепей было-б, каб саюзьнікі (антанта), калі думаюць чым дапамагчы Расіі,—паратавалі яе хлебам, бо голад у Расіі пануе, і машынамі, бо прадукцыя затрымалася праз іх недастачу.

Замест дыпльоматау і гэнэралау,—кліча Крапоткін да дзяржавау антанты,—прышлеце нам хлеба, машынау, і тэхнічных арганізатарау.